Цана асобнага нумару 250.000 м.

Сын Беларуса

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3.000000 м.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 400.000 мк., сярод тэксту 300.000 м. і на 4 стр. 250.000 м., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 2. Вільня, Чацьвер, 22-га травеня 1924 г. Год I.

Рэакцыя крапчэе.

Той паварот улева, які бачым у палітычным жыцьці Англіі і Францыі, знайшоў дужа яркі вотклік у Польшчы: віленская газэта „Słowo“ шчыра прызналася, што паражэньне Пуанкарэ і нацыянальнага блёку на апошніх выбарах у Францыі гэта паражэньне польскае палітыкі, якую вёў дагэтуль францускі ўрад.

Але трэба прызнаць, што п. Грабскі, як галава польскага ўраду, пры гэтым новым палажэньні выявіў сябе, як лоўкі палітык: ён зразумеў, што нельга ўжо прамаўляць да Эўропы языком Дмоўскага і польскіх фашыстаў, і вось мы бачым, што ў Лёндан едуць прадстаўнікі польскае „лявіцы“, каб сваей „фірмай“ бараніць сучасны буржуазна-нацыяналістычны ўрад у вачах новых кіраўнікоў палітыкі Англіі і Францыі.

За спэцыяліста па „абеліваньню“ польскае палітыкі ў адносінах да беларусаў і украінцаў абабраўся... галава партыі „Вызволене“, п. Тугут! Але з першых-жа крокаў сваей службы „радзімай“ рэакцыі п. Тугут страшэнна *аскандаліўся*. Мы маем уваччу яго адказ, дадзены п. Пэнлевэ на пратэст проці „белага тэррору“ ў Польшчы, надрукаваны ў францускай прэсе. П. Тугут напісаў п. Пэнлевэ, што гэны пратэст вельмі „перасолены“ і што цяпер над распазнаньнем спраў „нацыянальных меншасьцяў“ працуе адумысная камісія, у якой ёсьць прадстаўнікі „меншасьцяў“—жыд і беларус. — Вось-жа *п. Пэнлевэ мае ўжо ў руках сьпешныя запросы партыі „Вызволене“ ў сойме*, каторыя ў поўнай меры *пацьвярджаюць факты вастрожных зьдзекаў* над палітычнымі вязьнямі, аб якіх гаворыцца ў пратэсьце. Што-ж датычыцца заявы п. Тугута, быццам у камісіі дзеля спраў „меншасьцяў“ ёсьць жыд і беларус, дык гэта *самая бязглуздая мана: у гэтай камісіі няма ніводнага прадстаўніка „меншасьцяў“*, і аб гэтым, як нам наказуюць, *п. Пэнлевэ таксама ўжо павядомлены....*

Як бачым, „Вызволене“, якое ў часе выбараў выступала ў нас у ролі абаронцаў беларусаў, цяпер выявіла свой запраўдны твар: „вызволенцы“ перад усім сьветам стараюцца „абеліваць“ тую палітыку нацыянальнага ўціску, проці якой так нядаўна саміж пратэставалі...

Гэты рэзкі паварот у палітыцы „Вызволеня“ дужа характэрны і красамоўны: ён паказывае, што *польскі поступ пайшоў на хаўрус з „радзімай“ рэакцыяй*, і ўсё гэта—дзеля барацьбы з „меншасьцямі“, а ў першы чарод—з беларусамі. Эндэцкія газэты нават наказуюць, што п. Тугут вёў гутаркі з эндэкамі аб стварэньні супольнага ўраду—ведама, пад старшынствам яго, Тугута... І такога *прымірэньня* з учарашнімі ворагамі „Вызволене“ маніцца дайсьці коштам „меншасьцяў“....

Палітычная крутня „вызваленцаў“, а таксама і „пэпээсаў“ з п. Недзялковскім напарадзі, дае толькі лішні доказ, што ад усіх урадовых камісіяў да спраў „нацыянальных меншасьцяў“ нам нельга нічога спадзявацца. Больш таго: эндэцкая „Gazeta Poranna“ проста заклікае ўрад, каб у Заходняй Беларусі завясьці чуць што не *ваеннае палажэньне* (stan wyjątkowy), тлумачучы гэта... патрэбай барацьбы з бандытызмам!

Што на нашай зямлі працьвітае бандытызм у самых разнародных відах, гэта пацьвярджаюць штодзенныя весткі аб нападах і рабунках. Але, шукаючы прычын гэтага зьявішча, трэба прызнаць, што яно сталася магчымым іменна і выключна затым, што польская ўлада ўвесь час ужывала і ўжывае сваю 48-тысячную армію паліцэйскіх (ня кажучы ўжо аб дэфэнзыве і яе „супрацоўніках“ ды „конфідэнтах“) ня так дзеля абароны меньня і жыцьця грамадзян, а перад усім *на палітычную барацьбу* з „меншасьцямі“ і з рэвалюцыйнымі партыямі. І цяпер, калі бандыты ўсіх гатункаў сьмела падыймаюць галаву, эндэкі карыстаюцца гэтым ізноў-жа дзеля таго, каб узмацаваць уціск „меншасьцяў“ і апазіцыі, уводзячы „stan wyjątkowy“.

Што-ж: чыя сіла, таго і права! І мы можам спадзявацца, што вынікам тайных нарад урадовае камісіі да спраў „меншасьцяў“, *робленых дзеля заграніцы*, можа аказацца зьдзейсьненьне эндэцкае прапазіцыі. Але гэта ў свой чарод будзе толькі новы матэрыял для п. п. Пэнлевэ і... Чычэрына!

Вынікі і значэньне выбараў у Нямеччыне.

Як ведама, 4-га траўня адбыліся ў Нямеччыне агульныя выбары да яе парлямэнту (Рэйхстагу).

Вынікі гэтых выбараў можна было лёгка прадбачыць, дзякуючы сталаму ўплыву зусім выразных унутраных палітычных сілаў і ня менш акрэсьленых вонкавых абставінаў,—з якіх складаецца сацыяльна-палітычнае жыцьцё сучаснай Нямеччыны.

Найбольш моцны ўплыў на ўклад сілаў, на выбарныя лёзунгі і вынікі кампаніі мела тая фатальная палітыка ваеннай—пасьля міру!—акупацыі, якую практыкаваў адносна да *пабітага мілітарна*, але бязупынна *перамагаючага эканамічна* пераможцаў, нямецкага народу—ўрад п. Пуанкарэ...

Агульны характар тэй эвалюцыі, якая адбываецца ў Нямеччыне, — таго бязупыннага *нарастаньня пачуцьця сваей сілы* і свайго права на жыцьцё і разьвіцьцё—пасярод усё *пагаршаўшыхся* вонкава-палітычных варункаў, абражаючых, паміма рэальных крыўдаў, нацыянальную самапашану і гордасьць нямецкага грамадзяніна,—з усей дакладнасьцю і няўхільнай лёгікай зазначыўся ўжо ў выбарах 1920 г., — а яшчэ яскравей адбіўся ў апошніх.

Гэтая эвалюцыя настрояў грамадзянства адбілася на складзе новага парлямэнту далейшым, хаця, можа, меншым, як прарочылі, *усіленьнем абодвух крайніх флянгаў*, на якіх папіханы на рызыку выбаршчык заўсёды спадзяецца больш энэргічнай акцыі, можа цаной меншай адказнасьці... І, зразумела, гэтае ўсіленьне флянгаў адбываецца *коштам* заўсёды больш пасыўна-зраўнаважанага *цэнтру*, якому нямецкі выбаршчык востра закідаў *залішнюю павольнасьць адносна да гвалтаў акупацыйнай палітыкі Францыі.*

І ў запраўднасьці найбольш пацярпелі ў выбарнай барацьбе нямецкія *сац.-дэмакраты*, якія ў вачох сярэдняга выбаршчыка зьяўляюцца *найбольш адказнымі за першы пэрыад* істнаваньня Рэспублікі, і — нямецкія людоўцы, што дзялілі гэтую адказнасьць з с.-д. *за апошнія 4 гады...*

Аб складзе новага парлямэнту паданыя ў польск. газэтах галоўныя лічбы кажуць так: сац.-дэм. 100, каталіцкі цэнтр—62, дэмакраты—24, людоўцы—45.

Усяго—каля 240 паслоў...

З гэтых групаў і складаўся дагэтуль урадовы „цэнтралеў“.

Групы апазіцыі лічбова выражаюцца так: нацыяналісты, якіх у папярэднім Сойме было зусім мала, атрымалі столькі мандатаў, як і сац.-дэмакраты, — больш як 100; гітлераўцы—33; калі да гэтага дадаць некалькі дробных групаў, як буйныя абшарнікі і інш. дык *правая апазіцыя* вырасьце ў зусім паважную сілу—больш, як 160 паслоў.

Але найбольш цікавым і паказальным сымптомам нарастаньня „сацыяльнай вагі“ і краху толькі што ўсемагутнай сац.-дэмакратыі зьяўляецца ўвайшоўшая ў новы Сойм моцная група *камуністаў* у нябывалай яшчэ ў вялікіх дзяржавах лічбе 62 паслоў...

Рэзалюцыя, прынятая на Зьезьдзе сялян і работнікаў Баранавіцкага павету.

На зьезьдзе ў Баранавічах, аб чым мы пісалі ў № 1 „Сына Беларуса“, прынята гэткая рэзалюцыя:

Зьезд беларускіх сялян і работнікаў Баранавіцкага павету 4. V. 1924 г., заслухаўшы справаздачу паслоў Беларускага Пасольскага Клюбу аб іх працы у Сойме і Сэнаце і аб палажэньні Беларускай справы ў Польшчы, пастанавіў:

Прымаючы пад увагу ствaрыўшаеся ў Польшчы для беларускага народу палажэньне, якое выяўляецца ў тым, што:

1) землі беларускія раздаюцца асаднікам, а ня тутэйшаму малазямельнаму і беззямельнаму беларускаму сялянству,

2) лясы беларускія бязлітасна нішчацца і вывозяцца за граніцу, і нават Белавежская пушча ужо прададзена чужаземцам, а на адбудову зруйнаваных вайною гаспадарак амаль нічога не выдаецца, а у той самы час

3) на зруйнаванае вайною нашае сялянства накладаюцца непасільныя падаткі,

4) не дапушчаюцца беларускія школы, а зачыняюцца нават і тыя, якія ужо істнавалі падчас нямецкай акупацыі або „Сярэдняй Літвы“, і ў той самы час проціў волі народу адчыняюцца польскія школы,

5) прасьледуецца беларуская прэса,

6) прасьледуецца беларуская праваслаўная царква,

7) беларуская інтэлігэнцыя не дапушчаецца амаль ні да якой грамадзянскай і дзяржаўнай працы, ў значнам ліку пазбаўлена абыватэльства і знаходзіцца у вастрогах,

8) „крэсовая“ польская адміністрацыя адносіцца да нашага народу з надзвычайнай самаволяй,

9) сучасныя самаўрады ёсьць фальшаваньнем голасу нашага народу, а праэкт новага закону аб самаўрадах яўна імкнецца да такога-ж сфальшаваньня волі Беларускага народу, —

зьезд прызнае, што *толькі тады, калі землі беларускія, якія знаходзяцца у межах Польшчы, здабудуць сабе шырокую палітычную аўтаномію, з сваім асобным Соймам,— толькі тады і можна будзе урэгуляваць стасункі на Беларускай тэрыторыі ў Польшчы.*

З гэтых лічбаў вынікае перадусім, — што ўлада *пакуль што асталася ў руках таго самага цэнтру, які мeў яе дагэтуль.*

Бо кожнаму зразумела, што ўтварэньне ўрадовага аб'яднаньня нацыяналістаў з камуністамі — рэч зусім немагчымая, ня гледзючы на тое, што іх *лучыць* іх баявы настрой проці „акупантаў на захадзе і ўсходзе“, рашучая барацьба за скасаваньне Вэрсальскага Трактату і адмоўнае становішча адносна прапазыцыяў рэчазнаўцаў у справе адшкадаваньняў, — гэта значыць лучаць *справы вонкавай палітыкі...*

Адзіным рэзультатам такога складу палаты зьявіцца *моцнае аслабленьне гэтага ўрадовага цэнтру* і, наадварот, *моцныя ўплывы на яго з боку абедзьвюх опозыцыйных групаў*—правай і левай...

Ясна, што справы нацыяналістаў будуць рашуча ўплываць на штрэзэманаўскіх людоўцаў і блізкія ім сацыяльныя групы цэнтру, як злева камуністы будуць яшчэ мацней націскаць на страціўшых добрую частку сваей „фантазіі“ сац.-дэм...

А дзеля таго, што камуністы, як мы казалі, прымаюць загранічную праграму нацыяналістаў, якая сілаю рэчаў высоўваецца на першы плян, дык ясна, што *далейшая эвалюцыя палітычных настрояў*

і ўрадовай лініі навядзеньня ў Нямеччыне павінна пайсьці ў напрамку і пад лёзунгамі і моцнымі ўплывамі нацыяналістаў...

Урадовы „цэнтралев“ няўхільна будзе ператварацца—шляхам перагрупіровак у Сойме—ў усё больш фактычна падбіраючы ў рукі ўладу *„цэнтраправ“*... Вось, зусім выразны агульны рэзультат выбараў.

Вестка аб тым, што лідэр нацыяналістаў Гэргт мае быць шэфам габінэту, найляпей пацьвярджае нашыя вывады.

У нямецка-антанцкіх адносінах неяк дзіўна памяняліся месцамі кіруючыя групы: дагэтуль правыя прэм'еры Антанты дагаварываліся з нямецкімі ўрадамі ў большай ці меншай меры; цяпер будзе наадварот...

Ці прывядзе новая камбінацыя да разьвязаньня фатальнай для ўсей Эўропы праблемы адшкадаваньняў і наагул да ліквідацыі страшэннай спадчыны Вялікай вайны, пабачым.

Але ня можа быць сумліву ў тым, што цяпер усе тры найважнейшыя ў Эўропе ўрады—Нямеччыны, Францыі і Англіі—запраўды зробяць рашучую і шчырую спробу неяк вырашыць—хаця пакуль што чыста тэхнічным кампрамісам—гэтую фатальную праблему. Бо запраўды трывалае—бо радыкальнае—разьвязаньне агульна-эўрапэйскай блутаніны, *у зьвязку з рашучым пераглядам Вэрсальскага трактату*, магчыма толькі тады, калі на талерцы вагаў эўрапэйскай раўнавагі заважыць усей сваёй вагай адбудаваўшая сваю сілу да канца—наша ўсходняя суседка.

Палітычныя падзеі.

Водгукі пратэсту францускіх дзеячоў.

Камісія Сойму да азнаямленьня з вастрожнымі парадкамі 15 траўня нарэшце пачала сваю дзеяльнасьць. Відаць, падзеяла адозва францускіх дзеячоў...

Цікава, што ўваходзячы ў склад адміністрацыйнай камісіі Сойму, амаль не яе старшыня, лідэр „Вызваленя“ пас. Тугут, як нам перадаюць з Варшавы,—яшчэ ня толькі ня маючы выніку дасьледу, але і перад распачацьцем працы камісіі па разсьледаваньню,—ужо затэлеграфаваў у Парыж да п. Гэррыо, што ўсё тое, аб чым пісалася ў адозьве, няпраўда. Зьбіваючы іх довады, пан Тугут наўмысьля фальшуе факты, бо ў сваім лісьце да п. Гэррыо паказывае, што нібы ў камісіі рэчазнаўцаў да справаў аб меншасьцях нацыянальных і аб направе стасункаў на „Крэсах Усходнія“ працуюць адзін беларус і адзін жыд, у той час, як да памянёнай камісіі на самым дзеле не запрошаны ні адзін прадстаўнік ад нацыянальных меншасьцяў, а ўспомненыя прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў працуюць толькі ў адміністрацыйнай Соймавай камісіі.

Добра здае экзамін на міністра ўнутраных спраў пас. Тугут...

Да лёсу Багінскага і Вечоркевіча. Засуджаныя на сьмерць, але ўласкаўленыя,—пасьля „інтэрвэнцыі“ Радавага ўраду—п. Прэзыдэнтам Рэспублілі, вядомыя бамбісты-ахвіцэры польскай арміі Багінскі і Вечоркевіч толькі што перавезены з варшаўскай Макатоўскай турмы ў Кракаўскую, дзе будуць, як падае „Dz. Wil.“, трымацца на вельмі суровым рэжыме.

Тая-ж газэта падае вельмі цікавыя весткі аб тым, як весела і іранічна жартавалі сабе засуджаныя над зьявіўшыміся за імі ўва ўсей сваёй грознай велічы ўладамі.

„Narady kresowe“.

Польскі ўрад пад націскам з усіх бакоў рашуча быццам заняўся справамі „Kresów Wschodnich“.

Для папярэдняй нарады прэм. Грабскі арганізаваў досыць вялікую камісію, якая ўжо пачала працу, выслухаўшы абшырныя „рэфэраты“ міністраў аб агульным палажэньні на „Крэсах“ у галінах адміністрацыі, „стану беспячэнства“ і прасьветна-царкоўнай.

Вельмі цікавы склад „камісіі п. Грабскага“. Галоўнае ядро камісіі складае „палітычны камітэт“ Рады Міністраў. Другую групу сябраў складаюць паслы і сэнатары, якіх асабіста выбіраў і запрашаў п. Грабскі, паводле свайго густу...

І вось—найцікавейшае,—што да гэтай крэсовай камісіі не запрошаны ані адзін прадстаўнік Віленшчыны—сталічнага вокруга гэтых самых „Крэсаў“... не запрошаны—ня толькі паслы меншасьцяў, але нават „прыроджаныя гаспадары“ краю—паны палякі. Замест таго,—заміж ужо выбраных паслоў ад мясцовага насяленьня, якія, паводле Канстытуцыі, якраз і заклíканы да таго, каб „radzić i rządzić“ перадусім ў справах краю, п. Грабскім асабіста, так сказаць, „выбраны нанова“ і заклікаыы да нарады „свае паслы“ ў камісію—п. п. Мэйштовіч, быўшы „прэм'ер Сярэдняй Літвы“, Раман Скірмунт, вялікі абшарнік з Піншчыны, якога вельмі выхваляе віленскае „Słowo“, як „аднаго з нялічных людзей, што маюць праграму ўпраўленьня для паўночных ваяводзтваў Польшчы“..; п. Бжостоўскі запрошаны па рэкамэндацыі групы „Пяста“; пан Wakar, нейкі „idejowy wyzwoleniec“, таксама запрошаны да камісіі разам з п. Świechowskim—будуць прадстаўляць у ёй „лявіцу“, ці як кажа „Słowo“—„таго кірунку, які раскладае нашу дзяржаву і які згубіць Польшчу“...

Вось—усе „doradcy“ і рэчазнаўцы, якія будуць разважаць, а можа вырашаць аб „новым напрамку“ палітыкі адносна да нашага Краю... Аб нашым краі ізноў, як і заўсёды, будуць рашаць бяз нас, ці-ж у гэтым „новае“?!

Чатыры катастрофы.

У працягу першае паловы месяца мая ў Польшчы здарыліся чатыры катастрофы з вайсковымі аэрапланамі: 1, 10, 13 і 15 мая.

Палітычнае забойства?

У Дэмбне, Бжэскага павету, недалёка ад Кракава, надовячы забіты паліцэйскі Іодловскі. Яго застрэлілі, а пасьля цела пакалечылі дзеля непазнакі. Думаюць, што прычына забойства—палітычная, бо гэты паліцыянт адзначыўся пры выкрываньні шпіёнаў чужых дзяржаў.

Мітынг пратэсту ў Менску.

Роста падае вестку, што 14/V вечарам у Менску шмат-тысячная грамада работнікаў, служачых і вучняў сярэдніх і вышэйшых школаў зрабіла дэманстрацыю і мітынг пратэсту проці гвалтаў над беларусамі і ўкраінцамі ў Польшчы. Сябры ўраду Беларускай Сацыялістычнай Радавай Рэспублікі заверылі дэманстрантаў, што Радавы ўрад прыме ўсе меры да таго, каб Польшча выпаўняла варункі Рыжскага мірнага дагавора, забясьпечваючы нацыянальным меншасьцям іх нацыянальны быт.

Дэманстрацыя адбылася якраз у дзень угодак распачацьця першага палітычнага працэсу проці беларусаў—„працэсу 45 беларусаў у Беластоку“.

Прамова Старшыні Рады Народн. Каміс. Рыкава

У Маскве на партыйным сабраньні Старшыня Рады Камісараў сказаў прамову, у якой паміж іншым заявіў, што ангельска-расейская конфэрэнцыя ня дасьць памысных рэзультатаў, калі ангельскі урад будзе бараніць, як падставу да паразуменьня, жаданьні ангельскіх банкіраў.

„Васілёк“.

Збор на карысьць беларускае школы ў Наваградчыне.

5 чэрвеня 1924 г. адбудзецца ў Наваградку збор ахвяр на карысьць „Таварыства Беларускае Школы пачатковай і сярэдняй у Наваградку“. Эмблемай будзе малюнак *„Васілька“* з адпаведным напісам. Збор арганізоўваецца прэзыдыумам Рады памянёнага Таварыства.

Уважаючы на цяжкае палажэньне беларускага прыватнага школьніцтва, заклікаюцца Наваградчане да гарачага удзелу ў зборы і да шчодрых ахвяр на разьвіцьцё беларускае школы.

Надсыланыя Т-ву ахвяры з другіх паветаў і мейсцаў будуць прыймацца з глыбокай удзячнасьцю.

Усе спачуваючыя беларускаму школьніцтву запрашаюцца адгукнуцца ў гэты дзень 5. VI. 24 г. на карысьць Т-ва Беларускае Школы ў Наваградку.

Гаворачы аб зброеньнях у Эўропе і магчымасьці вайны, ён сказаў, што ССРР, ня гледзячы на гэта, зьменшыла лічбу сваей арміі, але ня можа зьменшыць яе якасьці.

ССРР ня можа гэтак азброіць сваей арміі, як гэта робяць Англія і Францыя, але патрапіць зрабіць гэтае лепш, чым Польшча і Румынія.

„А дзеля таго, што дыктатары сучаснай буржуазнай Эуропы ваюють ня самі, але пасылаюць ваяваць, заміж сябе, сваіх слуг, дык маем надзею, што мы гэтых лякаёў нашым войскам разаб'ем“.

(„Kur. Polski“).

„Ленінскі“ прызыў у С.С.Р.Р.

Рэзультат „ленінскага“ прызыву ў чырвон армію на 20-га красавіка: 269.372.

Пан Пуанкарэ і п. Мільеран.

Выбары ў Францыі ня толькі ўжо фактычна звалілі Пуанкарэ, але няўхібна выклікаюць адстаўку і самога прэзыдэнта Мільерана.

Левая прэса зусім слушна піша, што, калі прэзыдэнт не захаваў у барацьбе абедзьвюх старон належнай яго вышэйшаму пасту безстароннасьці, а наадварот—рашуча стануў на бок „нацыянальнага блёку“, дык павінен адчуць на сабе ўсе пасьледзтвы паражэньня сваей стараны... Каб змусіць прэзыдэнта да адстаўкі, лявіца мае ўжыць такой тактыкі: усе кандыдаты лявіцы, якім п. Мільеран запрапануе, пад пэўнымі варункамі, стварэньне габінэту, будуць рашуча адкідаць гэтыя варункі...

Гэткім чынам п. Мільеран павінен будзе зыйсьці са сцэны, як і п. Пуанкарэ...

Выбары ў Нямеччыне.

Пры выбарах у нямецкі рэйхстаг пададзена галасоў 23 з паловай мільёны. Тэўтонская партыя атрымала 1.900.000 галасоў, нямецк. нацыянальная партыя 4.600.000, дэмакраты — 1.600.000, партыя цэнтру — 3.200.000, сацыял-дэмакраты—5.000.000, камуністы — 3.600.000, гановэрская партыя—240.000 і дробныя партыі—700.000. Такім чынам сацыял-дэмакраты страцілі 81 мандат; буржуазныя партыі, што імкнуцца да

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Ня маючы часу на грунтоўную, ўсебаковую і сыстэматычную працу па высьвятленьню палажэньня беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі, але разам з тым адчуваючы вялікую патрэбу ў адпаведнай інфармацыі аб нашым жыцьцю тутака, — даю я беларускаму грамадзянству рад кароценькіх нарысаў на розных пытаньнях, якія часам будуць падобны да хронікерскае заметкі, часам разьвернуцца да цэльнае стацьці.

Буду дужа ўсьцешаны, калі вызаву абмен думак і запытаньні. З вялікай прыемнасьцю адкажу і на асабістыя лісты.

I.

Радавая Беларусь і Латвія.

Весткі аб пашырэньні тэрыторыі Радавае Беларусі і далучэньні да яе Вітабшчыны і Магілёўшчыны вельмі ўсьцешылі ўсіх шчырых прыхільнікаў беларускага нацыянальнага адраджэньня, бо ў факце гэтым латыскія грамадзкія дзеячы ўбачылі новую праяву і доказ абуджэньня нацыянальнае сьвядомасьці беларускага народу, нават у тэй яго частцы, якая, з іх пункту гледжаньня, была безнадзейна зрусіфіцыравана маскалямі.

Утварэньне 4-х мільённай Беларускай Дзяржавы з абшарам 100.000 кв. вёрст ацэніваецца імі, як факт аканчальнае перамогі ў беларускім руху дзяржаўна-незалежніцкае ідэі.

Але побач з гэтай шчырай уцехай найбольш далёкабачных палітыкаў, у некаторых шавіністычна-блізарукіх палітыканаў зьявіўся і перапалох:

„Як будзе ставіцца Радавая Беларусь да Латвіі?“.

„Ці не захоча яна адарваць ад Латвіі Латгалію, у якой жыве даволі значны лік беларусаў?“.

„Як глядзяць на пашырэньне Радавае Беларусі мяйсцовыя беларускія элемэнты?“.

„Ці не зьявіліся ў іх процідзяржаўныя думкі?“.

Гэта частка латвійскага грамадзянства пачала пільна прыглядацца да паасобных беларускіх дзеячоў і прыслухоўвацца да гутарак беларускага сялянства ў прырубежнай частцы Латгаліі.

Беларусы ў Латвіі, да апошняга моманту, вялі толькі культурна-прасьветную працу.

Палітыка і эканамічная праца асталіся з боку, бо не хапала сьвядомых працаўнікоў нават на тое, каб замясьціць усе вакантныя пасады вучыцялёў сярэдніх беларускіх школ, для чаго прыходзілася выпісываць працаўнікоў з-за межаў Латвіі.

Адсутнасьць беларускае палітычнае працы, адсутнасьць палітычных групіровак і партый у беларускай нацыянальнай меншасьці зрабіла тое, што ніводны беларускі культурна-прасьветны дзеяч ня мае ў вачох латвійскіх палітыкаў пэўна акрэсьленага палітычнага твару.

З гэтага поваду аб кожным з беларускіх дзеячоў у Латвіі пачаліся дагадкі, спраўкі, асьведамленьні і высьвятленьні.

Старыя ворагі беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі (з расейскіх і польскіх колаў) выкарысталі гэты момант для „дружественных указаний“.

Людзі, будуючыя сабе кар'еру ў рожных „охранных“ і „сыскных“ установах, з энэргіяй, дастойнай іх прафэсіі, кінуліся па новаму „сьледу“, шукаючы здарэньня што-кольвек „адкрыць“, „адшукаць“, „давесьці“.

Ну, зразумела, каля беларусаў у Латвіі павінен быў зрабіцца „бум“.

І ён зрабіўся.

Вось ужо з месяц беларусы маюць гонар штодня даведывацца аб сабе з латвійскае і расейскае прэсы рожныя цікавыя нябыліцы.

Найбольш „усердныя“ латвійскія чыноўнікі пільна шукаюць „беларускую крамолу“.

Усе прыраджоныя „асьведаміцелі“ і „інфарматары“ з запалам пішуць даносы.

Працуе ахранка.

II.

Карты Беларусі.

Інспэктар пачаткавых школ Дзьвінскага павету гр. Озолін „адшукаў“ у Дудэльскай беларускай пачаткавай школе Ужвальдзкае воласьці беларускую этнаграфічна-фізычную „Карту Беларусі“, выдадзэную у 1919 годзе ў Вільні і два гады правісеўшую ўжо ў памянёнай школе.

На карце Інспэктар убачыў, што этнаграфічная мяжа Беларусі акрэсьлена такім чынам, што захоплівае Дзьвінск і Люцын.

Інспэктар закіпеў.

Карту са сьцяны зараз-жа зьняў.

Напісаў рапарт у Міністэрства Прасьветы і туды-ж направіў крамольную карту.

Міністэрства перадала справу Пракурору.

Ідзець разсьледаваньне.

Злапалучная карта для ўжываньня ў школах ужо забаронена.

Найбольш нэрвовыя газэты з гісторыі аб гэтай карце ўжо робяць вывады аб процідзяржаўнай працы.

Трэба падкрэсьліць, што карта выдадзена была ў 1919 годзе, гэта значыць тады, калі дзяржаўныя межы Латвіі яшчэ не

аднаўленьня манархіі, і нацыяналісты выйгралі 28 мандатаў; народная партыя страціла 1/3 мандатаў; цэнтр страціў 7 мандатаў, якія перайшлі да камуністаў. Па лічбе мандатаў камуністычная партыя займець у рэйхстагу чацьвертае мейсца.

„Нямецкі дзень“.

У апошнюю нядзелю па ўсей Нямеччыне „сьвяткавалі“ арганізаваны нацыяналістамі „Нямецкі дзень“. Галосныя мітынгі і дэманстрацыі не абыйшліся без канфліктаў і боек, асабліва з камуністамі.

Паліцыя ўсюды трымала старану нацыяналістаў. Асабліва крывавая бойка ўзьнялася ў малым гарадку каля Бэрліна, скуль у апошні прыбыла каля 8.000 камуністаў, каб перашкодзіць нацыяналістычнаму „дню“. Паліцыя прыгатавала кулямёты... У выніку шмат камуністаў палягло. Ранены 3 паліцыянты. Шмат арыштавана камуністаў...

З газэт.

„Завясьці лад на Крэсах!“

Пад такім загалоўкам „Gazeta Poranna“ піша:

За апошнія часы публічную апінію занепакоіў цэлы рад бандыцкіх нападаў, якія здарыліся ў усходніх ваяводзтвах Рэчыпаспалітае, асабліва ў паветах Баранавіцкім, Нясьвіскім і пагранічных паветах Валыншчыны.

Банды, часта вельмі чысьленыя, а заўсёды дужа добра азброеныя і зарганізаваныя, нападалі пераважна на двары, рабуючы іх да тла, асабліва забіраючы інвэнтар. За апошнія 2—3 тыдні ў адным Баранавіцкім павеце бандыты вывялі больш за 140 найлепшых каней, спыніўшы гэтак работу ў цэлым радзе гаспадарак. Гэтыя банды падпаліваюць двары, лясы, атручываюць скаціну і г. д., што ясна паказывае, што яны маюць на мэце не выключна рабункі, але і сільнае імкненьне да выкліканьня анархіі ў усходніх ваяводзтвах, а прынамся ў іх пагранічных паветах.

I далей:

Уся гэтая акцыя, маючы выдатна палітычны характар, дэмаралізуе мясцовае беларускае і украінскае насяленьне, якое перастае верыць у трываласьць злучэньня гэтых зямель з Польшчай.

„Gaz. Por.“ выводзіць у канцы:

Калі цантральная ўлада не наважыцца на запраўды сільную палітыку ў ліквідаваньні гэтага замаху на цэласьць Рэчыпаспалітае, дык прыналежнасьць усходніх зямель да Польшчы можа ў хуткім часе апынуцца пад знакам запытаньня.

Міністар унутраных спраў, які наважыцца завясьці на усходніх крэсах „stan wyjątkowy“ (надзвычайную ахрану) і наладзіць тамака адносіны, можа спадзявацца ня толькі падтрыманьня ўсяго польскага грамадзянства, але і ўдзячнасьці вялізарнае большасьці тутэйшага беларускага і украінскага насяленьня.

Ну, з апошняй заявай трудна згадзіцца: надзвычайная ахрана—гэта такая страшэнная рэч перш за ўсё іменна для мірнага беларускага і украінскага насяленьня, што за гэткае „уладжаньне“ адносін нельга спадзявацца ўдзячнасьці беларусаў і украінцаў!

ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ

сэнатараў Беларускага Клюбу п. Міністру Справядлівасьці і п. Міністру Унутраных Дзел у справе аб біцьці і катаваньні арыштаваных Станіслава Дразда з в. Кутоўшчына, Цырынскае вол., Андрэя Калесьніка з в. Краснагоркі, Гарадзейскае вол., і п. Лашука з в. Макашы.

5 красавіка г. г. ў м. Нясьвіжы, Навагрздзкага ваяводзтва, сэнатарам А. Назарэўскім у прысутнасьці п. Чудзіновіча, падпракурора Акружнага Суда ў Навагрудку, сцьверджаны гэткія беззаконьні і гвалты дзяржаўнае паліцыі:

1. У Нясьвіжы пад арыштам знаходзіцца п. Лашук з в. Мікашы, якога арыштавала дзяржаўная паліцыя з постэрунку ў Гарадзеі, падазраваючы ў кражы мукі. Арыштаваны сцьвярдзіў, што пасьля арышту 27 сакавіка г. г. яго павязьлі ў Нясьвіж, гдзе ў Камандзе паліцыі вывядоўца „Нітка“ пачаў яго страшэнна катаваць, прымушаючы, каб прызнаўся да віны. Біў яго па галаве, па твару, пасьля яму зьвязалі рукі, залажылі пад калены, прасунулі між рук і ног палку, кінулі на зямлю і пачалі біць палкаю ў пяткі, аж пакуль не самлеў. Усё гэта рабілася ў прысутнасьці трох паліцэйскіх. Знакі катаваньня, а іменна тое, што галава і ногі папухлі, можна было ўстанавіць нават 5 красавіка г. г.

2. Другі арыштаваны, Станіслаў Дрозд (в. Кутоўшчына, Цырынскае гміны, Нясьвіскага павету), знаходзіцца ў хірургічнай бальніцы ў Нясьвіжы. Падазраваючы яго ў кражы мукі, яго арыштавалі з 1-га на 2-ое сакавіка, але звольнілі пад залог 10.000.000 марак, бо ня было выстарчаючых падстаў, каб дзяржаць у вязьніцы. 24-га сакавіка Дразда ізноў арыштавалі, павязьлі ў Нясьвіж, дзе вывядоўца „Нітка“ страшэнна мучыў яго ў працягу цэлае ночы, ад 9 гадз. вечара да раніцы. Паліцэйскія № 943 і № 1802 і вывядоўца „Нітка“ білі арыштаванага па галаве, па твару, па баках, вязалі рукі, закладалі іх пад калены, прасоўвалі палку між рук і ног, кідалі на зямлю і білі палкамі ў пяткі да паўсьмерці. Калі катаваны прыходзіў да прытомнасьці, яго прымушалі ўзяць на сябе віну. Каб не цярпець далей мукаў, арыштаваны сказаў, што прызнаецца да кражы. У сувязі з гэтым вывядоўца „Мікіта“ 25 сакавіка г. г. павёз арыштаванага Дразда ў вёску Краснагоркі, каб паказаў месца, дзе схаваны крадзеныя рэчы. Вярнуўшыся да хаты, Дрозд убачыў у пасьцелі сваю хворую жану (другі дзень пасьля радзін), якая сустрэла мужа блага за прыняцьце на сябе вялікае ганьбы—кражы. Тлумачучы жонцы, што ня мог далей цярпець мукаў, якія рабіла яму польская паліцыя, ён дайшоў да стану роспачы і, каб давясьці чыстасьці свайго сумленьня, пачаў есьці тытун, ды схапіў сякеру і адсек сабе тры пальцы на левай руцэ. Па вышэйуспомненых муках, цярпеньнях і перажываньнях Станіслаў Дрозд быў памешчаны ў бальніцы ў Нясьвіжы.

3. Падобныя-ж зьдзекі і мукі ўчынены трэцяму арыштаванаму, Андрэю Калесьніку, з вёскі Краснагоркі, Гарадзейскае гміны, Нясьвіскага павету, а пасьля яго звольнілі пад залог 50 міліонаў марак.

Ня гледзячы на тое, што міністэрства ўнутраных спраў быццам-то выдала загад аб спыненьні біцьця арыштаваных, апошняе адбываецца дагэтуль.

Дзеля гэтага ніжэйпадпісаныя пытаюцца ў п. п. Міністраў:

1. Ці ведама ім, што дзяржаўная паліцыя на беларускіх землях дагэтуль чыніць мукі і зьдзек над арыштаванымі?

2. Ці маняцца яны пацягнуць да адказу ня толькі паліцэйскіх, якія б'юць і зьдзекуюцца над арыштаванымі, але і каманданта паліцыі, якому падлягаюць вінавайцы гвалтаў і мукаў?

Варшава, 6 травеня 1924 г.

Інтэрпэлянты.

былі акрэсьлены ў аканчальнай форме, а дзеля таго на карце, якая асобна азначала межы этнаграфічныя і асобна межы дзяржаўныя, усходняя дзяржаўная мяжа Латвіі ня была абазначана зусім, а была праведзена толькі мяжа Латвіі з Эстоніяй і Літвой.

Калі карта ў 1922 годзе разсылалася Беларускім Аддзелам у школы, дык была нанесена на ей дзяржаўная мяжа Латвіі і на ўсходзе, згодна з міравым трактатам 1920 году.

Самае-ж цікавае гэта тое, што мяжа гэта не разыходзіцца ні з даваенными навуковымі данымі, ні з латвійскім перапісам, зробленым у 1920 годзе.

III.

Геаграфія Беларусі.

Аркадзь Смоліч напісаў Геаграфію Беларусі.

„Няхай“, пісаў ён, „карыстаюцца вучыцелі і школы першай спробай Беларускае геаграфіі“.

Агледзіў „Геаграфію Беларусі“ якійсь цікавы латыскі прафэсар і выдаў гэткую апінію:

„Геаграфія А. Смоліча задужа шырокія акрэсьліла межы для беларускага народу. Для латвійскае-ж дзяржавы дык і зусім зьяўляецца яна шкоднай“.

Геаграфію забаранілі ўжываць у беларускіх школах Латвіі.

I вучаць дзеці цяпер геаграфію без падручніка па геаграфіі.

Маніцца выдаць новую геаграфію Беларускі Аддзел, але калі гэта будзе—няведама.

Кастусёнак.

(Далей будзе).

Перасьледаваньні паноў.

„Słowo“ друкуе гэткую карэспандэнцыю з Рыгі:

З Масквы паведамляюць, што на засяданьні сельскіх работнікаў прынята пастанова, паводле каторае ніводзін абшарнік ня мае права арэндаваць двара і меншых фальваркаў у ваколіцах, дзе некалі валадаў зямлёю. Быўшых абшарнікаў пазбавяць нават надзелаў, калі ня могуць вырабіць іх сваімі рукамі і карыстаюцца наймітамі.

Весткі з вёскі.

Пагроза польскай школе.

Віленскія польскія газэты ўсіх кірункаў друкуюць цікавыя весткі аб пагрозе істнаваньню ў нас на вёсках польскіх народных школ.

Справа ў тым, што гэныя школы заведзены ў нас *прымусова*—супраць волі беларускага насяленьня, якое дарэмна дабівалася школы ў сваей роднай мове. Вось-жа, пакуль іх утрымліваў польскі ўрад, усё было добра, і нам вядомы факты, што істнавалі нават такія польскія школы, куды хадзілі па пяцёх, трох вучняў, а то і зусім ніхто ня вучыўся. З гэтае прычыны шмат дзе беларускіх дзяцей пачалі гвалтам прымушаць хадзіць у польскую школу, штрафуючы вельмі цяжка непаслухмяных бацькоў. Але цяпер і гэта не паможа! Бо ў сувязі з рэформай польскіх фінансаў урад пераложыў кошты ўтрыманьня школ на самаўрады. Самаўрады-ж і без таго перагружаны падаткамі, і вясковыя гміны пры ўкладаньні бюджэтаў на другое паўгодзьдзе г. г. ня могуць знайсьці крыніц дзеля пакрыцьця выдаткаў на школы. Самахоць-жа народ даваць складку на польскую школу, як сьцьвярджаюць польскія газэты, ня мае ніякае ахвоты.

Дарогай дабравольных ахвяр—піша „Słowo“ і „Dzien. Wil.“—школы *маглі-бы ўтрымацца толькі ў тых нячысьленых мясцовасьцях*, дзе вучыцель здабыў сабе ў бацькоў вучняў асаблівае прызнаньне і пашану.

Зусім справядліва, што *такіх* мясцовасьцей вельмі мала, а мо' і зусім няма. I гэтай сваей заявай польскія газэты толькі пацьвярдзілі вядомы ўсім беларусам факт, што *наш народ ня хоча польскае школы*, што ён дамагаецца сваей, беларускай.

Але з гэтага беларускае сялянства павінна зрабіць свой вывад. Раз школа можа ў нас істнаваць толькі з *самахвотных* складак, дык няхай сяляне робяць адпаведныя зборы на такую школу, якая ім патрэбна, значыць, на беларускую. I ўжо няма патрэбы ў такіх прыпадках прасіць, каб школа была ўрадовая, „казённая“: даволі прасіць аб пазваленьне на прыватную беларускую школу, ці зварачацца да Беларускае Цантральнае Школьнае Рады, каб яна адчыніла школу на сваё імя, але на кошт сялян—бацькоў вучашчыхся.

Такім парадкам для *беларускае* школы пагрозы няма: пагроза істнуе толькі для нялюбае народу, непажаданае і прымусовае школы ў чужой мове.

Як жывуць Жыровіцы.

(*Ад нашага карэспандэнта*).

Жыровіцкі праваслаўны манастыр ёсць адна з найвялікшых сьвятынь беларускага народу, а па свайму цантральнаму палажэньню нават займае першае мейсца для праваслаўных беларусаў. Фундатарам гэтага манастыра быў Аляксандар Солтан, продак і да гэтага часу яшчэ досыць вядомага ў Польшчы былага беларускага, але цяпер ужо спольшчанага роду Солтанаў. Збудаваны гэты манастыр яшчэ ў 1470 г. на мейсцы—як наказывае мяйсцовае паданьне—зьяўленьня цудоўнага абраза Боскай Маткі. Абраз гэты пад час эвакуацыі вывезены быў у Маскву, а ў манастыры у гэты час знаходзіцца толькі копія. Гэта сьвятыня заўсёды зьбірала і цяпер зьбірае ў пэўныя дні (23-га красавіка, 7-га траўня і др.) шмат (тысячаў да 10—12) народу ў Жыровіцы амаль не з усей Беларусі...

У пачатку XVII в. (ў 1613 г.) манастыр Жыровіцкі, як і дужа многа другіх праваслаўных манастыроў, быў захоплены праз уніятаў, у руках якіх знаходзіўся да самага 1839. З гэтага часу Жыровіцы ўзноў зрабіліся цэнтрам праваслаўнага жыцьця Беларусі, бо тут была катэдра праваслаўнага мітрапаліта. Манастыр быў адным з цэнтраў прасьветы з самых даўных часоў, яшчэ да уніі. За часы уніі там была адчынена гімназія, а потым духоўная сэмінарыя, пераведзеная толькі ў 1845 г. ў Вільню ў Сьв.-Траецкі манастыр, заместа чаго там была адчынена духоўнае вучылішча. Насяленьне мястэчка Жыровіц і ўсіх аколіц яе—сплашное беларускае, нават сплашное праваслаўнае. Ня лічучы прышлага элемэнту (паліцыя, урадоўцы ўсяго асоб дзесяць), у Жыровіцах толькі чатыры каранныя жыхары каталікі: адзін мужчына і тры кабеты. Ня гледзючы на гэта, пасьля вайны мяйсцовае каталіцкае духавенства адабрала ў праваслаўных адну царкву, а пасьля мяйсцовая ўлада адабрала і аддала ў карыстаньне паляком зямлю, лясы, гароды, адзін сад, палову другога і большасьць будынкаў. У бядынку былога духоўнага вучылішча зьмяшчаецца ў гэты час прытулак. Дзеці ў прытулку былі праваслаўныя і яшчэ ў папярэднім годзе іх вадзілі ў праваслаўную царкву на набажэнствы і да споведзі. Але з гэтага году водзяць ужо ў касьцёл, які зроблены з захопленай царквы і, як апавядае людпасьць на-

ша, усіх, апрача чатырох альбо пяцёх старэйшых, якія яшчэ трымаюцца ўпарта сваей веры, перарабілі на палякоў. Вучаць дзяцей, вядома, толькі папольску.

Беларускае пасяленьне, як у самых Жыровіцах, так і ў аколіцах, дужа стэрорызована ўціскам паліцыі, нават да таго, што баіцца жаліцца на розныя тварымыя там над ім надужыцьці. Дзякуючы гэтаму, маленькая жменька палякоў-каталікоў, якая знаходзіцца ў Жыровіцах, безкантрольна там пануе, захоплівае колькі хоча манастырскай зямлі і будынкаў, а на жалабы праваслаўных паліцыя адмаўляецца нават і састаўляць пратаколы. Але ўсё-ж любоў да сваей гістарычнай сьвятыні і нацыянальнае, а таксама і рэлігійнае пачуцьцё, змусіла іх падаць на бязпраўныя захваты скаргу ў Беларускі Пасольскі Клюб, які ў справе гэтых надужыцьцяў зрабіў інтэрпэляцыю да міністра.

2-га траўня дайшлі да Беларускага Пасольскага Клюбу весткі, што на 4-га траўня гатуецца захват другой Жыровіцкай царквы. Клюб неадкладна камандзіраваў у Жыровіцы аднаго з сваіх сяброў, сэнатара Багдановіча, які зрабіў 3. V. інтэрвэнцыю ў Слонімскага старосты, і той абяцаў зрабіць пэўныя крокі, каб папярэдзіць магчымасьць захвату, і запраўды паслаў у Жыровіцы 4-га траўня свайго ўрадоўца. Нападаў на царкву ў гэты дзень ня было, але ўсё-ж у часе, калі ішло праваслаўнае набажэнства і ўсе манахі былі ў царкве, некалькі жыровіцкіх палякоў з адным прыездным з Слоніма афіцэрам, як паказывалі сьведкі,—у прысутнасьці 2-х паліцыянтаў і ксяндза,—зьбілі з 2-х манастырскіх брамаў замкі, а тых сялян, якія выпадкова былі гэтаму сьведкамі, пачалі арыштоўваць і не заарэштавалі, дзякуючы толькі прысутнасьці і адпаведнай інтэрвэнцыі пасланага Клюбам сэнатара. Аб усім гэтым састаўлены быў пратакол па запатрабаваньню настаяцеля манастыра архім. Ціхана і сэнатара Багдановіча. Пад час царкоўнай бяседы і мітынга, які быў зроблены сэн. Багдановічам, народ дужа скардзіўся на ўціскі пры наборах падатку, асабліва пры ацэнцы зямлі, і ў адносінах да царквы. З гэтае прычыны ўсе жывуць там пад пэўным страхам ці арэштаў, ці пабояў, ці адабраньня ўласнасьці. Між іншымі падаў адзін з маладых тамашніх жыхароў скаргу аб тым, што, змушаючы яго прызнацца ў тым, чаго ён не рабіў, паліцыя дужа катавала яго.

В. Б.

Напад на мяст. Крывічы.

Віленскія газэты пішуць: ма мяст. Крывічы, якое ляжыць у 30 в. ад радавай граніцы, 18 г. м. я 8 гад. ўвеч. напала банда з 30 душ, узброеных у карабіны, рэвальвэры і ручныя гранаты, акружыла мястэчка, перарэзаўшы ўсе тэлеграфныя і тэлефонныя дроты. Заняўшы ўсе дарогі з мястэчка, бандыты пачалі рабаваць яго жыхароў. Першай ахвярай стаўся ксёндз Весялоўскі. Другая група напала на паліцэйскі пастэрунак; 2 паліцыянты забіты, адзін ранены. Абрабаваўшы ўсіх багацейшых жыхароў, бандыты на 14 падводах павязьлі ўсё да граніцы С.С.Р.Р.

Напад і абезаружаньне.

Паводле „Gaz. Por.“, банда, зложаная з 20 душ, прабавала перайсьці з-за межаў С.С.Р.Р на тэрыторыю Лунінецкага павету.

Банду заўважыў пагранічны вартаўнік, Язэп Булат, які падняў трывогу. Бандыты пачалі страляць у яго з вінтовак і ранілі яго, а пасьля, крэпка пабіўшы прыкладам, кінулі ў балота. Вінтоўку Булата забралі, а пакінулі сваю з паламаным прыкладам.

Забойства двух паліцэйскіх.

„Gazeta Poranna“ наказывае, што ў в. Харастова, каля Лунінца, бандыты ў часе рабунку застрэлілі двух паліцэйскіх: Любяжа і Гэльмана і ўцяклі. За імі выслана ў пагоню рота салдатаў 84 п. п.

Лясныя пажары ў Ашмяншчыне.

Як наказывае „Dz. Wil.“, у двары Мар'ента п. Рычэрскага, Гальшанскае гміны, згарэла 7 дзесяцін лесу.

Каля мястэчка Веленішкі ўзьняўся пажар у лесе п. Корзана. Выгарэлі дзьве дзесяціны.

У абодвух прыпадках прычына пажараў ня высьнена.

ХРОНІКА.

Агульны сход Т-ва Беларускае Школы адбудзецца, як ужо абвешчана ў папярэднім нумары, 24-га мая а 4 гадз. папалудні ў памешканьні Т-ва, Віленская вул. 12, кв. 6.

Скарынінская камісія. У сувязі з 400-гадовым юбілеем беларускага друку ў Вільні, які прыпадае ў 1925 годзе, Беларускае Навуковае Таварыства ўзяло на сябе арганізацыю сьвяткаваньня гэтага вялізарнага беларускага культурнага сьвята. Згодна з пастановай агульнага сходу Таварыства, створана адумысная „Скарынінская камісія“, якая складаецца з гэткіх асоб: старшыня — дырэктар Віленскае Беларускае Гімназіі Р. Астроўскі, віцэ-старшыня — сэнатар В. Багдановіч, скарбнікі—паслы Б. Тарашкевіч і кс. А. Станкевіч, сэкрэтар — пасол С. Рак-Міхайлоўскі, сябры: адвакат Казлоўскі і каапэратар Э. Будзька.

Камісія ўжо адбыла некалькі нарад, на якіх пачала распрацоўку пляну дзейнасьці. Плян гэты хутка будзе закончаны, і тады падамо яго ў газэце.

Аб долі Віленскае Праваслаўнае Сэмінарыі мы з зусім верыгоднае крыніцы даведываемся, што справа пераходу яе ў рукі дзяржавы ўжо аканчальна вырашана. *Ад гэтае восені навука ў першых дзьвюх клясах сэмінарыі будзе адбывацца папольску*, пашыраючыся з кожным годам на адну наступную клясу.

Але ў гэтай справе асабліва характэрна тое, што за рэктара ўрадовае сэмінарыі сьвецкая ўлада назначае старага рэктара а. Піліпа, вядомага сваімі варожымі адносінамі да беларусаў, якога дукоўная ўлада ў асобе сыноду звольніла з гэтага становішча! Астаецца на сваім месцы, як урадовы служачы, таксама і інспэктар Дзічкоўскі. Дагэтуль з старых вучыцялёў, апрача гэтых двух, залічаны ў штат яшчэ два; рэшта мае быць ад восені звольнена, і іх месцы займуць вучыцялі, якія будуць вучыць ужо папольску.

Як нас паведамляюць, адміністрацыя сэмінарыі стараецца гэта ўкрываць перад грамадзянствам, каб не ўзьняліся пратэсты на праектаваным улетку эпархіяльным зьезьдзе.

Гэтак тыя людзі, што змагаліся з ідэяй зьбеларушчаньня сэмінарыі, дапялі сваей мэты: замест беларускае сэмінарыя будзе польскай.

Адгалоскі маёвага сьвята. У справе нападу банды эндэцкіх студэнтаў і гімназістаў на работніцкі мірны паход 1 мая высьняюцца цікавыя падробнасьці.

Банды напасьнікаў зьбіраліся на Дабрачынным завулку. Паліцыя іх бачыла, але ім не перашкаджала, дый не адганяла, калі кідаліся на дэманстрантаў.

На Віленскай вуліцы каля Мястовае аптэкі „пшодовнікі“ успакаівалі публіку, кажучы, што банды напасьнікаў „idą bić żydów“.

Паліцыя адабрала ў дэманстрантаў некалькі чырвоных сьцягаў, у тым ліку па Вялікай вуліцы быў забраны сьцяг прафэсіянальнага саюзу будаўляных работнікаў з надпісам: „Niech żyje rewolucja socyalna!“ Цікава, што гэты самы сьцяг насілі і на леташнім сьвяткаваньні работніцкага сьвята, але тады ніхто яго не чапіў. Цяпер, відаць, павеяў новы вецер....

Звальненьне гр. Кэпеля. У пятніцу 16. V. звольнены з Лукішскай турмы Старшыня Бацькаўскага Камітэту пры Віл. Бел. Гімназіі, грам. Мітрафан Кэпель, які быў заарыштаваны ўначы з 30. IV. на 1. V г. г. Беларускае грамадзянства Вільні пераконана, што грам. Кэпаль быў заарыштаваны дзякуючы блізкім стасункам да віленскай дэфэнзывы аднаго віленскага панка, якога выкрыта, урэшці, нават і клічка: „*Jacek*“. Данос на Кэпеля быў зроблены праз помсту, бо Кэпель свайго часу, на сходзе 3. II. 24 г., раскрыў, як старшыня Рэвізыйнай Камісіі, карыгодную дзейнасьць „Старшыні старшынь“ так званага Бел. Грамадз. Сабраньня ў Вільні, пана Станіслава Валэйшы.

Паўторны арышт. Уначы з 14 на 15 траўня г. г. ў другі раз пасьля дэталічнае рэвізыі памешканьня на Антокалі быў заарыштаваны Канчэўскі, сябра Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады ў Вільні, і пасаджаны ў Віленскую турму на Лукішках. Прычыны арышту невядомы.

Цягнуць пад суд пана Уладыслава Лапурку. Ужо тры тыдні, як адвакатам Т. Врублеўскім пададзена ў суд ад імя дэпутатаў Сойму Пётры Мятлы, Сым. Рак-Міхайлоўскага, дырэктара Віл. Бел. Гімн. Р. Астроўскага і др. 15 асобаў на аднаго з „grona слаўных“, прадстаўніка „польскай партыі“, як ён сябе называе, у так званым Бел. Грамадз. Сабраньні, Уладыслава Лапурку, скарга за клевету.

Сьмерць літоўскага дзеяча Я. Кімонта. 18-га мая памёр стары заслужоны літоўскі дзеяч Ян Кімонт, пражыўшы 70 гадоў.

Нябошчык паклаў многа працы дзеля літоўскае справы ў Вільні, ператрываўшы на становішчы ў часе ўсіх акупацыяў. Калі Вільню займалі Літвіны, п. Кімонт быў прэзыдэнтам места.

З беларускім грамадзянствам нябошчык быў у вельмі блізкіх адносінах, бо жонка яго, нябошчыца Марыя Кімонтовая (Ячыноўская), была беларуска і вядома, як кампазытарка, улажыўшая музыку да апэрэткі В. Дунін-Марцінкевіча „Залёты“.

Пахавалі Яна Кімонта 20 мая.

Хай лёгка будзе яму родная зямліца!

Обыск ў літоўскім інтэрнаце. У начы 11 мая, як паведамляе „Lietuv. Rytas“, паліцыя зрабіла обыск у літоўскім інтэрнаце пры Панамарскай вул. Як відаць, некага шукалі, ды не знайшлі.

Цікава, што ў тую-ж ноч, як мы ўжо пісалі, некага шукалі і ў беларусаў.

Суд над літоўскім рэдактарам. 13 мая Віленскі Акружны Суд засудзіў на 5 месяцаў у вастрог грам. Яна Кукліса, рэдактара літоўскае газэты „Vilniaus Kelias“, за надрукаваньне стацьці „На сьвяткаваньне 600-лецьця закладзінаў Вільні“. Справу разглядалі пры зачыненых дзьвярох. Бараніў падсудзімага вядомы адвакат Т. Врублеўскі.

Працэсіі з Літвы ў Кальварыю. З Літвы пробавала прайсьці цераз граніцу, кіруючыся да Кальварыі пад Вільняй, каталіцкая працэсія з крыжам і штандарамі, сьпяваючы польскія касьцельныя песьні. Пагранічная варта не прапусьціла іх. Тады працэсія прапяяла набожную песьню і спакойна вярнулася назад.

Віленскія эндэкі зусім паважна пішуць, быццам працэсія мела на мэце... адабраць Вільню ад Польшчы! Дзеля гэтага „Dzien. Wil.“ друкуе паскудны і дурны данос па віленскіх літвіноў, якія на Сёмуху мавяцца ладзіць ў Вільні „Сьвята Песьні“.

Цікава прыпомніць, што, калі ў 1911 годзе беларусы ў Вільні ладзілі на Вяльлі Купальскае сьвята, маскоўскія чарнасоценцы друкавалі падобныя даносы, кажучы, быццам „беларусы хочуць заваяваць Вільню“.

Няўжо-ж справа Вільні стаіць для Польшчы так блага, што нават літоўская песьня можа ёй наградзіць?!...

Напад польскіх студэнтаў на жыдоўскую рэдакцыю. У рэдакцыю жыдоўскае газэты „Ді Цайт“ колькі дзён таму назад уварваліся трое польскіх студэнтаў і зажадалі, каб ім сказалі, хто напісаў стацьцю, якая гэным студэнтам вельмі не спадабалася. Ім у гэтым было адмоўлена. Тады адзін з іх ударыў заступніка рэдактара. Прыбегшыя працаўнікі рэдакцыі і наборшчыкі хацелі затрымаць напасьнікаў і завясьці іх у паліцыю. Студэнты папробавалі сілай вырвацца і ўцячы і пачалі біць людзей палкамі. Ды ад гэтага самі вельмі пацярпелі, ды іх, пабітых, усё-ж завялі ў паліцыю і сьпісалі пратакол.

Прадстаўнікі рэдакцыі былі ў гэтай справе у рэктара унівэрсытэту, які заявіў, што студэнты будуць аддадзены пад дысцыплінарны суд.

„Dziennik Wileński“, бароняючы „сваіх“, вінаваціць не „ваяўнічых“ студэнтаў у нападзе на рэдакцыю, а... рэдакцыю ў нападзе на студэнтаў! Відаць, рэдактары эндэцкае газэты прызнаюць кулачныя расправы за дапусьцімыя і ў адносінах да іх самых!

Безпадстаўныя пагалоскі. Узноў пашыраюцца чуткі, паходзячыя з урадовых крыніц аб намячаным высяленьні ўсіх беларускіх інстытуцыяў з дому № 9 пры Вострабрамскай вуліцы. Надовячы расейская газэта „Виленское Утро“, друкуючы заметку аб „высяленьні з казеннага дому“, нават вызначае тэрмін гэтага высяленьня — першыя лічбы ліпеня м-ца г. г.

Мы сьцьвярджаем, што чуткі аб „высяленьні“ ня могуць мець пад сабой жаднае падставы. Беларускія інстытуцыі і ўстановы зьмяшчаюцца ў памянёных будынках на моцы кантракту з уласьнікам будынкаў—праваслаўнай эпархіяльнай уладай. Кантракт гэты мае сілу да канца 1926 году. Гэта гварантуецца істнуючымі цяпер законамі.

Праўда, на памянёныя будынкі прэтэндуе ўрад, але справа аб законнай прыналежнасьці гэтых будынкаў судом яшчэ ня вырашана. У кожным разе, калі-б, урэшці, удалося ўраду адабраць па суду гэтыя будынкі ад праваслаўнага духавенства, дык новы ўласьнік ня мае права ігнараваць кантракту аб арэндзе будынку беларускімі культурнымі і дабрачыннымі інстытуцыямі.

У Віленскім Апэляцыйным Судзе мае разглядацца 22. V. 24 г. справа Дварэцкіх, Шлойдаў, Шацёра і інш. беларускіх юнакоў з акалічных вёсак каля ст. Аляхновічы. Віл. Акр. Судом гэтыя хлапцы засуджаны былі свайго часу на кару 6—8 гадоў кожны „за ўчасьце ў загаворы, які меў на мэце адарваньне беларускіх зямель ад Польшчы і рабунковыя напады“, як сказана ў прыгаворы Акружнага Суда.

Абаронцам выступае віл. адв. Т. Врублеўскі.

Сельска-гаспадарскія парады.

Як прымусіць няплодлівае дрэва даваць плод.

Нярэдка можна пачуць ад селяніна скаргу на тое, што ў яго яблыня або дуліна вырасла „вышэй лесу“, а не даець плоду, або даець ды зусім мала.

Такія непладлівыя, ялавыя дрэвы зазвычай бываюць тады, калі яны растуць на надта сытным грунце, а асабліва яшчэ тады, калі мейсца прынізкаватае і на яго маець сьцёк жыжка з хлявоў. Маючы зашмат спажыву, дрэва што год даець многа сукоў, хутка ідзець угару і не закладываець пладавых пупышак. Гэткім парадка мяблыня або дуліна можаць пражыць гадоў дваццаць і не даваць пладоў.

Каб прымусіць такое ялавое дрэва даваць плады, вясковыя садоўнікі радзяць „запусьціць у дрэва гніль“. Іначай кажучы, з здаровага дрэва зрабіць хворае. Гніль запускаюць яны так: у ствале дрэва аж да самага сэрца выкручываюць сьвярдлом некалькі дзірак, якія з часам загніваюць, а ад іх гніль пераходзіць на ўсё дрэва. Праўда, пасьля гэтай апэрацыі, дрэва, прадчуваючы сваю хуткую сьмерць, пачынаець даваць надта многа плоду, але за тое цераз колькі гадоў зсыхаець.

Лепшы спосаб прымусіць ялавое дрэва даваць плады будзе такі.

У восень або раньняй вясной кругом дрэва на адлегласьці аршына 1½—3, уважаючы па велічыні дрэва, (чым дрэва меншае — тым бліжэй і наадварот) капаецца канава глыбінёю на аршын, усе карэньня, якія будуць спатыкацца, перасякаюцца тапаром, стараючыся, каб не пашчапаць каранёў. Канцы адсечаных каранёў лепей абраўняць нажом. Пасьля вырытая яма засыпаецца зямлёй ізноў.

Дрэва, страціўшы гэткім парадкам большую частку каранёў, меней дастанець з зямлі спожыву, ня будзе так буйна расьці і закладзець к другому году многа пладовых пупышкаў. Калі-ж гэтыя пупышкі запатрабуюць спожыву на рост пладоў, да гэтага часу адсечаныя карані пусьцяць ад сябе шмат маладых каранькоў, якія і дадуць дрэву спажыў.

Я. П.

Наша пошта.

І. Валынцу. Тры мільёны атрымалі. Газэту высылаем.

П. Шорцу. Грошы 3,600,000 атрымалі. Газэту высылаем.

Ахвяры на друк газэты:

Ад сына Зах. Беларусі Віктара Вік—скага 140 злотых.

Рэдактар-Выдавец М. Шыла.

Друкарня Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.